# Ужыванне тэрміна “арыянства” адносна тэалагічных поглядаў Сымона Буднага

**Барнюк Аляксей Сяргеевіч,**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*Даклад прысвечаны пытанню, наколькі правамерна пераносіць назву антычнага накірунка ў хрысціянстве на пазнейшую канфесію на ўзоры поглядаў Сымона Буднага. Тэрмін “арыянства” шырока ўжываецца адносна тэалогіі Сымона*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Буднага ў беларускай, украінскай і польскай гістарыяграфіі. Але гэты перанос мае спрэчную аргументацыю і з'яўляецца хутчэй гістарыяграфічнай традыцыяй. Погляды Сымона Буднага былі падобнымі да арыянскіх у перыяд яго адыходу ад кальвінізма, але ў выніку ён перайшоў да радыкальнага антытрынітарызма, адрознага ад іерархічнага, але трынітарнага арыянства.*

У беларускай гістарыяграфіі, як і наогул у гістарыяграфіі постсавецкіх краін, прынята называць погляды беларускага тэолага Сымона Буднага “арыянствам”. Назва гэта часцяком узаемазамяняльна з непасрэдна тэрмінам “антытрынітарызм”, “унітарызм” і нават “сацыніянства”. Узнікае пытанне, наколькі правамерна выкарыстоўваць гэты тэрмін адносна поглядаў тэолага. Для гэтага неабходна параўнаць сцвярджэнні ў тэалагічных вучэннях арыян і Буднага.

Арыянства – накірунак у хрысціянстве (ерась), які атрымаў шырокае распаўсюджанне на тэрыторыях Рымскай імперыі і германскіх каралеўстваў. Папулярным арыянства стала ў IV стагоддзі, яго ж перашапрапаведнікам выступіў прэсвітэр Арый з Александрыі, хаця яго нельга назваць стваральнікам вучэння ў поўным сэнсе. Сцвярджалася створанасць асобы Хрыста і яго падобасутнасць Богу, а не адзінасутнасць, як у кафалічным хрысціянстве [1]. На працягу Ранняга Сярэднявечча кафалічнае хрысціянства стала пануючым на тэрыторыях “варварскіх” каралеўстваў, кіруючыя колы гэтых дзяржаў адмовіліся ад падтрымкі арыянскай царквы і апошняя зыйшла з гістарычнай сцэны [1].

Антытрынітарны накірунак у рэфармацыйным руху – радыкальнае адгалінаванне ад асноўнага пратэстанцкага вучэння. Частка рэфарматаў не спынілася на лютэранстве, кальвінізме і іншых канфесіях, а перайшла да больш шырокіх зменаў у веравучэнні. Знакамітымі прыхільнікамі гэтых ідэяў былі: іспанскі доктар Мігель Сэрвэт, аўтар працы “Christianismi Restitutio” (“Аднаўленне хрысціянства”); італьянскі тэолаг Фаўста Сацыні; польскі тэолаг і прапаведнік Пётр з Ганёндза; Сымон Будны - рэлігійны дзеяч, філосаф, пісьменнік, публіцыст і кнігавыдавец Вялікага Княства Літоўскага.

Неабходна сказаць, што аб'яднаць антытрынітарны рух у адзінае цэлае немагчыма – гэта шырокая група рэлігійных вучэнняў, прадстаўнікі якіх не знаходзілі паразуменне паміж сабой. Так, Сымон Будны актыўна палемізаваў з Пётрам з Ганёндза [3, с 41–42]. Менавіта погляды Буднага і яго паплечнікаў варта разглядаць, як прыклад антытрынітарнага вучэння з Вялікім Княстве Літоўскім.

Немагчыма не сказаць, што погляды Буднага змяняліся ў розныя перыяды жыцця [3, с. 138]. Пачаўшы, як і іншыя дзеячы антытрынітарызму, у рэфармацкім руху, паступова яны перайшлі да вызнання нетрынітарных поглядаў [4, с. 260]. Аднак ці магчыма іх звязаць з арыянствам?

Яшчэ ў савецкай гістарыяграфіі, хаця і выкарыстоўвалі тэрмін “арыянства” ў адносінах да антытрынітарнай плыні, указвалі, што гэты тэрмін “не зусім адпавядае сутнасці вучэння” [2, с. 7]. Погляды Буднага ў розныя перыяды дэманстравалі розныя тэндэнцыі, некаторыя з якіх сапраўды можна палічыць падобнымі да арыянскіх. Так, на пачатку сваёй дзейнасці ён быў прыхільнікам кальвінісцкага вучэння, але ў шасцідзясятыя гады XVI стагоддзя ў вучэнні Буднага пачынае ўзнікаць сумнёў у тым, што Хрыстос быў спрадвеку, да стварэння свету, як гэта вучыць кафалічнае хрысціянства [3, с. 28]. Тут яго ідэі сапраўды пачынаюць паходзіць на арыянскія, бо вучэнне “класічных” арыян указвала, што Бог стварыў Сына, то бок, Бог-Сын існаваў не адразу, а стаў часткай Троіцы па стварэнні [1]. Арыяне таксама не адмаўлялі боскай сутнасці Хрыста, як не адмаўляў яе ў той перыяд і Будны [3, с. 119, 129].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Будны таксама пісаў, што Бог стварыў сусвет “bez sługi, syna i towarzysza” [5, с. 85]. Пры разглядзе гэтых выказванняў тэолага, сапраўды бачыцца разумным назваць іх “арыянскімі”, “аміўсіянскімі”, безумоўна са значнай доляю ўмоўнасці [4, с. 125].

Погляды Сымона Буднага не спыніліся ў развіцці. Так, ужо ў сямідзясятыя гады XVI стагоддзя, ён пачаў адмаўляць асобнасць Святога Духа. У кафалічным хрысціянстве гэта асоба адзінага, але траічнага Бога; Будны жа стаў вызнаваць яго сілаю Бога [4, с. 138] і прывёўшы шматлікія сведчанні з Бібліі, гэта падцвердзіў перад сваімі апанентамі [4, с. 140].

Паступова Будны адыйшоў і ад ідэі таго, што Хрыстос гэта толькі дасканалы чалавек, Месія, але не Бог. Ён палічыў, што гэта была інтэрпаляцыя, ўвёдзеная у тэкст Маркіёнам [5, с. 29–30, 78]. У яго канцэпцыі не засталося месца культу Хрыста, Бог Буднаму стаў бачыцца нетрынітарным і адзіным [4, с. 260]. У заходняй гістарыяграфіі Буднага называюць антытрынітарыям альбо ўнітарыям [4, с. 94, 133]. Сапраўды, погляды арыян не прадугледжвалі існавання непадзельнага Боства, хаця яны і ўводзілі ў Троіцу субардынацыю, але не адмаўляліся ад яе.

Такім чынам, погляды Сымона Буднага пры пачатковым адыходзе ад трынітарнага вызнання, сапраўды былі падобнымі да арыянскіх, але з цягам часу яны эвалюцыянавалі да радыкальна антытрынітарных. У выснове неабходна сказаць, што называць Буднага “арыянінам” – гэта хутчэй памылковая гістарыяграфічная традыцыя. Яго погляды патрэбна акрэсліваць, як“антытрынітарныя” альбо “унітарысцкія”.

**Літаратура**

1. *Бриллиантов, А.И.* Лекции по истории Древней Церкви [Электронны рэсурс] / А. И. Бриллиантов. – Санкт-Петербург, Санкт-Петербургская Духовная Академия, 1911. – Рэжим доступа: https://azbyka.ru/otechnik/Aleksandr_Brilliantov/lektsii-po-istorii-drevnej-tserkvi/3_2: – Дата доступа: 24.02.2017
2. *Парэцкі, Я.І.* Сымон Будны / Я. І. Парэцкі. – Мінск : Выдавецтва БДУ, 1975. – 168 с.
3. *Саверчанка, І.В.* Сымон Будны – гуманіст і рэфарматар / І.В. Саверчанка. – Мінск : Універсітэцкае, 1993. – 223 с.
4. *Fleischmann, S.* Szymon Budny. Ein theologisches Portrait des polnisch-weißrussischen Humanisten und Unitariers (ca. 1530-1593) / S. Fleischmann. – Köln : Böhlau Verlag KölnWeimar Wien, 2006. – 278 s.
5. *Merczyng, H.* Szymon Budny jako krytyk tekstów biblijnych / H. Merczyng. – Kraków : Akademia umiejętności, 1913. – 178 s.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова